Нягледзячы на невялікую колькасць удзельнікаў акцыі, каля стадыёна было сканцэнтравана шмат міліцыі і нават аўтобус з АМАПам. Супрацоўнікі праваахоўных органаў канфіскавалі прывезеныя ўдзельнікамі акцыі газеты і ўлёткі. Менавіта за іх распаўсюджванне былі затрыманыя дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання Павел Знавец, публіцыст і гісторык Анатоль Сідарэвіч. Аднак потым у гарадскім аддзеле міліцыі абодвух затрыманых адпусцілі.

30 лістапада група прадстаўнікоў БНФ у складзе 50 чалавек выехала ў Слуцк для ўскладання кветак і ўстаноўкі крыжа на месцы размяшчэння Слуцкага палка. Аднак аўтобус быў спынены каля паста ДАІ на выездзе з Мінска, дзе яго пратрымалі больш за гадзіну. Былі перапісаныя прозвішчы ўсіх людзей, якія знаходзіліся ў аўтобусе, а таксама праведзены вобыск. Толькі калі ўдзельнікі акцыі выйшлі з аўтобуса і акружылі пост ДАІ, ім дазволілі ехаць далей. У Слуцку раённыя ўлады забаранілі прадстаўнікам БНФ правесці мітынг на плошчы Леніна. Таму дэлегацыя накіравалася ў пасёлак Чырвоная Слабада, дзе мела намер устанавіць мемарыяльны крыж на месцы размяшчэння Слуцкага палка.

Па словах аднаго з удзельнікаў акцыі гісторыка Уладзіміра Юхо, у раёне пасёлка таксама знаходзілася вялікая колькасць міліцыі. Афіцэр папярэдзіў прыехаўшых, што ўстаноўка крыжа забароненая мясцовымі ўладамі. Удзельнікі акцыі абмежаваліся ўскладаннем кветак.

Па словах Уладзіміра Юхо, гадавіну паўстання палка прадстаўнікі БНФ адзначаюць ужо пяты год запар. Аднак упершыню ўлады перашкаджалі правядзенню мерапрыемстваў.

Генадзь БАРБАРЫЧ.

Грошы для сям'і спевака

Каля чатырох мільёнаў рублёў добраахвотных ахвяраванняў сабрала Гомельская гарадская арганізацыя БНФ "Адраджэнне" падчас двухдзённай акцыі "Салідарнасць".

Грашовыя сродкі збіраліся ў падтрымку сям'і зняволенага беларускага барда Андрэя Мельнікава, які ўжо амаль чатыры месяцы сядзіць за кратамі ў гродзенскім следчым ізалятары. Нагадаем, што ён быў арыштаваны каля беларуска-літоўскай мяжы і абвінавачваецца ў яе незаконным пераходзе. Калі скончыцца следства, пакуль невядома. Абаронцам А.Мельнікава выступае адвакат Уладзімір Кісялевіч.

Між тым жонка Андрэя Анжэла і ягоны паўтарагадовы сын, якія жывуць у Гомелі, не толькі пакутуюць маральна, але і трапілі ў вельмі цяжкую матэрыяльную сітуацыю. Сабраныя Народным фронтам грошы дапамогуць ім перажыць гэтыя цяжкія часіны. Анжэла (яна выкладчыца Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, цяпер знаходзіцца ў аддзячынку па доглядзе за дзіцем) выказала ўдзячнасць усім, хто праявіў салідарнасць і падтрымаў яе ў бядзе.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ.

У сталіцы — хворыя кабеты

Для большасці жанчын, якія жывуць у беларускай сталіцы, вынасіць і нарадзіць дзіця — вялікая праблема. І галоўная прычына — слабое здароўе.

Як паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінскім гарвыканкаме старшыня камітэта аховы здароўя Генрых Карніцкі, нягледзячы на ўсе медычныя мерапрыемствы, у Мінску за апошнія гады стан здароўя жанчын, якія хочуць і маглі б мець дзяцей, пагоршыўся. Статыстыка сведчыць, што ў 1996 годзе 51% жанчын мелі захворванні, што напрамую не звязаныя з мацярынствам, але ўскладняюць цяжарнасць і нараджэнне дзіцяці. Пры гэтым больш за ўсё кабеты церпяць ад анеміі (малакроўя). Нармальна роды прайшлі летась толькі ў 11,9% жанчын, а 58% парадзіх мелі розныя ўскладненні. Смяротнасць сярод мацярок складае 30 выпадкаў на 100.000 чалавек, а, паводле крытэрыяў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, гэта небяспечна высокі паказчык для еўрапейскай краіны.

Аднак не толькі слабое здароўе не дае жанчынам магчымасці вынасіць і нарадзіць здаровае дзіця. Вялікая колькасць абортаў. За мінулы год праведзена 60 аперацый на 1.000 жанчын дзетароднага ўзросту, а за першую палову 1997 года — 58. У сярэднім на адны роды прыпадае больш за два аборты, іншымі словамі, на свет з'яўляецца толькі 30% зачатых дзяцей.

І высокі ўзровень абортаў, і шырокая распаўсюджанасць гінекалагічных захворванняў (а ў Мінску каля 5% кабет маюць хранічныя хваробы спецыфічнай жаночай сферы) у многім звязаныя з нізкай палавой культурай людзей. Так, эфектыўныя і бяспечныя метады кантрацэпцыі выкарыстоўваюць не больш за чвэрць жанчын. Пастаянна расце колькасць дзяўчат-падлеткаў, якія маюць гінекалагічныя хваробы, прычым часта яны з'яўляюцца вынікам праведзенага аборту.

На думку спецыялістаў, неабходна арганізаваць бясплатнае лячэнне жанчын ад анеміі, а таксама забяспечыць жаночыя кансультацыі сучасным дыягнастычным і тэрапеўтычным абсталяваннем. Акрамя таго, эксперты пагаджаюцца, што паляпшэнне здароўя жанчын немагчымае без шырокамаштабнай кампаніі па прапагандзе здаровага ладу жыцця, выхавання сексуальнай культуры ў навучальных установах.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Хоць ты ў школу не ходзі

У Бабруйску выпадкі атручвання ў навучальных установах становяцца вельмі небяспечнай тэндэнцыяй.

Ужо некалькі разоў паведамлялася пра выпадкі масавых атручванняў навучэнцаў за апошнія два месяцы. Асабліва не шанцуе студэнтам вучылішча дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. На пачатку лістапада каля 50 навучэнцаў трапілі на шпітальныя ложкі з дыягназам "вострая кішэчная інфекцыя". Прычым некаторыя з пацярпелых толькі нядаўна змаглі пакінуць бальніцу.

І вось чарговы прыкры выпадак: больш за 20 чалавек з сімптомамі дызентэрыі зноў у бальніцы. Праверка паказала, што на кухні ў вучылішчы не вытрымліваліся санітарныя нормы пры мыцці посуду, а кухоннае абсталяванне за апошнія 20 год практычна не мянялася. І асаблівых спадзяванняў на лепшае няма, бо ў вучылішча няма грошай.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН.

Скандалам закончылася ў Варшаве пасяджэнне Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, прысвечанае пытанням чалавечага вымярэння

На заключным пасяджэнні тэма закрыцця беларускай газеты "Свабода" стала галоўнай. На гэты конт зрабілі рэзкія заявы кіраўнікі дэлегацый з Люксембургу, Нарвегіі, Польшчы, Злучаных Штатаў Амерыкі. Кіраўнік амерыканскай дэлегацыі, у прыватнасці, сказаў: "Палітыка ўрада Беларусі выклікае вялікую заклапочанасць ва ўрадзе Злучаных Штатаў. Дзеянні ўрада Лукашэнкі супраць незалежнай прэсы, супраць дэмакратычных структур і грамадскіх арганізацый — гэта прыклад няздольнасці ўрада Беларусі дзейнічаць у адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі АБСЕ. Гэта заслугоўвае асуджэння ўсім сусветным і еўрапейскім супольнітвам". І калі заява кіраўніка амерыканскай дэлегацыі з'яўляецца лагічным працягам палітыкі Белага дома ў дачыненні да Беларусі, то абсалютна нечакана прагучалі ў Варшаве рэзкія заявы кіраўнікоў дэлегацый такіх да апошняга часу нейтральных краінаў, як Нарвегія, Люксембург і Польшча. Дарэчы, жорсткі выступ кіраўніка польскай дэлегацыі Браніслава Герэмека (ён з'яўляецца міністрам замежных спраў РП) сведчыць пра змену афіцыйнай пазіцыі Варшавы ў дачыненні да Мінска. Нагадаем, што раней (напрыклад, на саміце ў Вільні ў верасні гэтага года) прэзідэнт Польшчы Аляксандр Квасьнеўскі заяўляў пра неабходнасць супрацоўніцтва з Беларуссю.

Жорсткія заявы наконт Беларусі — скандал для АБСЕ надзвычайны. Як вядома, гэтая арганізацыя была ўтворана ў 1975 годзе для пошуку шляхоў супрацоўніцтва паміж Варшаўскім блокам і NATO. У АБСЕ наогул выключаліся рэзкія заявы, а краіны прадстаўляліся выключна афіцыйнымі дэлегацыямі. Гэтым разам ад Беларусі акрамя афіцыйнай дэлегацыі на чале з намесніцай міністра замежных спраў Нінай Мазай быў запрошаны Генадзь Грушавы, які прадстаўляў Асамблею няўрадавых арганізацый нашай краіны.

Дарэчы, выступ Ніны Мазай на Варшаўскай нарадзе АБСЕ многія расцанілі як здзек. У прыватнасці, намесніца міністра замежных спраў РБ заявіла, што дэмакратычныя працэсы на Беларусі не спыненыя, а рухаюцца, хоць і павольна, у бок еўрапейскіх стандартаў. Каб пацвердзіць свае словы, спадарыня Мазай нават паведаміла, што ўрад Беларусі жадае абвясціць наступны год годам захавання правоў чалавека ў Беларусі. Пасля гэтага нават кіраўнік расійскай дэлегацыі ўпершыню не змог сказаць нічога ў абарону свайго сталага пратэжэ на ўсіх еўрапейскіх форумах.

Вынікам жа Варшаўскага пасяджэння АБСЕ для нашай краіны стала рашэнне стварыць у наступным годзе ў Беларусі пастаяннае прадстаўніцтва АБСЕ па правах чалавека.

Яцэк ГАРБУЗОВІЧ.

Васіль Быкаў, Міхаіл Чыгір, Віктар Купрэйчык пра забарону "Свабоды"

Васіль БЫКАЎ, народны пісьменнік:

— Пасля забароны "Свабоды" праўды ў беларускім грамадстве, несумненна, паменела, але не паменела прагі да яе, хутчэй наадварот. Чым болей дыктатарскі рэжым будзе душыць праўду, тым болей да яе будзе патрэба. У гэткіх варунках узрастае доля адказнасці пакуль яшчэ ўцалелых сродкаў масавай інфармацыі, хаця іхні лёс таксама перадвызначаны. Рана ці позна яны таксама будуць панішчаныя. Рэжым на Беларусі ўсталёўваецца "ўсур'ёз і надоўга", гэтая ўлада ні на якія стасункі, ні на якія правы чалавека не будзе зважаць. І тут важна, каб незалежныя СМІ не мелі залішніх ілюзіяў ашалець з дапамогай кампрамісаў. Нявыказаная сёння праўда можа застацца нявыказанай ніколі. Гэта трэба памятаць тым, хто яшчэ мае голас, хто не знямеў у гэты драпежны час. І пакуль яшчэ ёсць каму слухаць.

Міхаіл Чыгір, былы прэм'ер-міністр Беларусі:

— Закрыццё "Свабоды" асабіста я ўспрымаю як вельмі абуральны факт. У свой час, калі я быў прэм'ер-міністрам, "Свабода" часта крытыкавала мяне, часам вельмі жорстка. Але я лічыў, што вы маеце на гэта права, і не быў у прэтэнзіі. Упэўнены, што калі чалавек ідзе ва ўладу, ён павінен быць гатовы, што не ўсе ягоныя дзеянні і рашэнні будуць успрымацца на "ўра". Наадварот, чым больш крытычным будзе аналіз дзеянняў улады, тым здаравейшай будзе сама ўлада. На жаль, кіраўніцтва Беларусі дэманструе іншы падыход. Не выключана, што ўдар па "Свабодзе" нанесены, каб спыніць актыўнасць незалежнай прэсы, якая апошнім часам стала цэнтрам барацьбы за дэмакратыю. Я маю на ўвазе рух за падпісанне "Хартыі-97" — вельмі неабходнага менавіта цяпер дакумента, які нарэшце дае магчымасць аб'яднаць намаганні дэмакратычных лідэраў з простым насельніцтвам. Зразумела, што не ўсіх такая перспектыва задавальняе.

Усё ж я спадзяюся, што "Свабода" адновіць свой выхад. Наўрад ці вам дапаможа хтосьці з кіраўніцтва краіны — там "Свабоду" ўсе чыталі, аднак публічна выказацца за яе цяпер ніхто не асмеліцца. Спадзявацца трэба на падтрымку міжнародняй грамадскасці ды грамадзянаў Беларусі, асабліва чытачоў "Свабоды". Сям'я Чыгіроў сярод іх, мы з вамі!

Віктар КУПРЭЙЧИК, гроссмейстер, победитель и призер международных шахматных турниров:

— Постановление суда о закрытии газеты "Свабода" я расцениваю как бездумное решение. По Белорусскому телевидению было объявлено, что популярность и тираж вашей газеты якобы упали. Но я, как давний читатель вашей газеты и многих других изданий, знаю, что найти "Свободу" в газетных киосках в конце рабочего дня было невозможно, в то время как, например, "Советская Белоруссия" есть на прилавках почти всегда.

Вам инкриминируют "разжигание социальной розни". Но дело в том, что однородного общества не существует. На этом обожглись еще классики утопизма Сен-Симон и Оуэн. Если же кого и закрывать за разжигание социальной розни, то в первую очередь "Агентство телевизионных новостей" Белорусского телевидения — за надменность и напыщенность ведущих типа Хрущевой и Зимовского, за их однобокий, корявый и бессовестливый комментарий.

В России никому не приходит в голову закрывать газеты, находящиеся на противоположных политических полюсах. Право каждого гражданина выбирать ту информацию, которая его интересует.

Как журналист (по образованию) я считаю, что мои коллеги имеют право на творчество, право проводить любые параллели. Например, "Свободу" обвинили в том, что газета сравнивает 97-й с 37-м годом. Возможно также сравнить с 1917-м, когда социальная рознь достигла апогея. По-моему, деятельность "Свободы" была направлена как раз на то, чтобы извлечь уроки из событий тех лет и не допустить их повторения.

На мой взгляд, чиновники Госкомпечати малообразованны, так как не знают не только историю, но и литературу. Запрещали ведь и "Белую гвардию" Булгакова, и "Доктора Живаго" Пастернака. Люди все равно это прочли, только, к сожалению, поздно. В современных условиях "Свободу" прочитают — слово не закроешь. Я, как гражданин, считаю, что мое право — выбирать себе предмет чтения, а не следовать решениям каких-то чиновников.

Былое

Адольф в Борисове...

Да, действительно, в начале войны, когда Борисов был оккупирован немецко-фашистскими захватчиками, на аэродромном поле у д.Демидовка со своей свитой приземлился Адольф Гитлер. О прилете германского канцлера знали только непосредственные участники встречи...

Кстати, сей факт многие исследователи трактовали по-разному. Некоторые вообще высказывали сомнение о визите фюрера в Борисов. На руках у автора данного материала имеется копия ответа (оригинал передан в местный краеведческий музей), полученного им из Исследовательского военно-исторического института г.Фрейбурга (Германия), в котором приводятся выдержки из книги "Unternemen Barbarossa" (Paul Carell) о том, что в 1941 году Гитлер неоднократно посещал Борисов.

А 4 августа 1941 года в бывшем панском имении (ныне контора агрофирмы "Старо-борисов"), где находился штаб группы армий "Центр", которой командовал генерал-фельдмаршал фон Бок, Гитлер провел совещание. В нем приняли участие известные немецкие военачальники — Кейтель, Иодль, Гудериан, Готт и другие.

Именно здесь, на Борисовщине, противник обсуждал план нанесения главного удара. Генералитет настаивал сконцентрировать основные силы рейха на московском направлении. Однако Гитлер напомнил им о трагической судьбе наполеоновской армии, заявив, что захват Москвы — не главная цель вермахта. Важнее всего для Германии, считал фюрер, — промышленные районы России...

Чем закончился поход немцев на восток, известно: международный военный трибунал в Нюрнберге приговорил 12 главных нацистских преступников к повешению. Приговор был исполнен в ночь с 15 на 16 октября 1946 года. Их экзекутором стал Джон Вуд, сержант американской армии, который специально для этого изготовил петлю с тринадцатью узлами. К месту казни доставили и труп Геринга, отравившегося ядом. После исполнения приговора тела казненных были тайно перевезены в Мюнхен и сожжены в местном крематории, а пепел сбросили в реку Изар, протекающую через баварскую столицу. Лишь один из работников крематория знал истинные имена кремируемых. Для всех остальных они были жертвами автокатастрофы.

Как известно, наци №1 Гитлер, дабы не попасть в плен, застрелился. Ибо знал, что с ним произойдет, если попадет в руки Сталина: Иосиф Виссарионович намеревался поместить его в клетку и возить по улицам советских городов.

Другой нацист, Геббельс, также предпочел (умертвив свою семью) уйти из жизни самостоятельно. Впоследствии их тела были сожжены во дворе имперской рейхсканцелярии в воронке от снаряда...

А.ШУСТОВСКИЙ.

Поветрие

К здоровью только пешком

Раньше бы этот лозунг звучал по-другому: "Бегом — к здоровью". Но с некоторых пор на Западе моду на оздоровительный бег трусцой сменила мода на пешие прогулки. Если недавно в Америке страшно было выйти утром на улицу — того и гляди собьют угорелые бегуны, — то теперь все эти спортсмены-любители чинно и подолгу гуляют. В Голландии и Скандинавских странах вечером после работы уже никто не ходит в тренажерные залы: специальные ботинки на ноги и — вперед! Ходят целый час, прежде чем пойти наконец домой. Правильно, спорт — это не шутка!

Новый спорт — walking — по сути ходьба, более быстрая, чем обычная, и более щадящая, чем бег трусцой. Он полезен для дыхательной и сердечно-сосудистой систем и не очень утомителен. Подходит для людей любого возраста. А заниматься можно и в городе, и на природе. Достаточно знать несколько основных правил, обзавестись удобной обувью — и можно начинать усиленное оздоровление своего организма. Первые "сеансы" должны длиться полчаса, а потом увеличиваются до часа в день.

Г.КАСЬЯНИКОВА.

Анекдотики

Преступника ведут расстреливать.

— Какой сегодня день? — спрашивает он.

— Понедельник.

— Ничего себе неделька начинается!

* * *

— Интересно получается: я тебя пригласила, чтобы ты выпил за мое здоровье, а ты хлещешь уже пятый стакан!

— Извини, но ты так плохо выглядишь.

* * *

— Где лучше всего заниматься любовью с женщиной?

— Конечно, в подъезде! Если ты выше ее, можешь встать на ступеньку ниже, если ниже, то наоборот... Ну а если никак не получается, можно сказать: "Ой! Кто-то идет!"

* * *

Адвокат задает вопрос свидетелю:

— На каком расстоянии от места преступления вы находились?

— Три метра семьдесят сантиметров.

— Откуда такая точность?

— Специально измерил, всегда какой-нибудь идиот об этом спросит.

* * *

— Вы обвиняетесь в оскорблении личности. Вы сравнили своего соседа с ослом.

— Простите, а кто из них жалуется?

* * *

Мужик горестно повторяет:

— Зачем я их позвал? Зачем я их позвал?

Прохожий:

— Что такое?

— Да побили меня и уходили уже, а я увидел лом на земле и кричу им: "Идите сюда, козлы!" Они вернулись, а лом к земле примерз. И зачем я их позвал?

Дзень у гісторыі

6 снежня

■ У 1742 г. нарадзіўся **Нікала Леблан,** французскі хімік-тэхнолаг, які першым распрацаваў прамысловы спосаб атрымання соды з кухоннай солі. У гады Вялікай французскай рэвалюцыі Леблан быў загадчыкам парахавой і сялетравай вытворчасці.

■ У 1925 г. адкрылася **І Усебеларуская мастацкая выстаўка.**

■ У 1929 г. пачалася **забастоўка чыгуначнікаў у Мексіцы.**

■ У 1938 г. была падпісана **франка-германская дэкларацыя** аб ненападзенні і мірным урэгуляванні спрэчных пытанняў.

■ У 1938 г. пачаўся **І з'езд мастакоў Беларусі.** На ім быў заснаваны Саюз мастакоў Беларусі. (Творчасць — справа індывідуальная, але дзеля задавальнення пэўных сацыяльных патрэб творцы, як птушкі, вымушаны "збівацца ў чароды". Напэўна, для таго каб разам ляцець у "вырай"...)

■ У 1941 г. **Англія аб'явіла вайну** Фінляндыі, Венгрыі і Румыніі. Другая сусветная вайна была ў самым разгары.

■ У 1990 г. у Мінску закончыла сваю работу **Міжнародная сустрэча кіраўнікоў скаўцкіх арганізацый** з 20 краін Заходняй Еўропы і Амерыкі.

7 снежня

■ У 43 г. да н.э. памёр **Марк Тулій Цыцэрон,** старажытнарымскі аратар, палітычны дзеяч, адвакат і пісьменнік — вялікі майстар слова. Слова "палітыка" падобнае да "паэтыкі" і літаральна азначае "мастацтва жыць разам".

■ У 1742 г. у Берліне была заснавана **Нямецкая Дзяржаўная опера** — адзін са старэйшых музычных тэатраў Германіі.

■ У 1912 г. нарадзіўся **Мікалай Тарасавіч Раманоўскі,** беларускі эканаміст і географ. Пасля вайны ён быў дэканам геаграфічнага факультэта БДУ. Удзельнічаў у стварэнні атласа БССР.

■ У 1921 г. у Заходняй Беларусі было заснавана **Таварыства беларускай школы** (дзейнічала да 1937 г.).

■ У 1926 г. у Вільні выйшаў першы нумар газеты **"Народны звон"** — органа Беларускай сялянска-работніцкай грамады.

■ У 1931 г. у ЗША узяў старт **першы нацыянальны паход беспрацоўных** у Вашынгтон.

■ У 1941 г. пачалася **вайна ў Ціхім акіяне.** Японскі флот напаў на Ганконг, Філіпіны і іншыя амерыканскія, брытанскія і галандскія ўладанні.

■ У 1942 г. загінула **Вера Харужая,** беларуская рэвалюцыянерка і падпольшчыца, закатаваная немцамі. У Драгічыне, Мазыры, Пінску, Пружанах зараз стаяць ёй помнікі.

■ У 1988 г. у Арменіі здарылася **землетрасенне,** у якім загінула шмат людзей.

8 снежня

■ У 1815 г. нарадзіўся **Адольф фон Менцэль,** нямецкі мастак, які стварыў карціны на тэмы гісторыі Германіі і жыцця Фрыдрыха II. Пасля рэвалюцыі 1848—1949 гг. у творчасці мастака ўсталёўваюцца дэмакратычныя тэндэнцыі, ён піша карціны аб людзях працы, новай тэхніцы і г.д.

■ У 1865 г. нарадзіўся **Ян Сібеліус,** фінскі кампазітар, які стварыў музыку па паэтычных узорах нацыянальнага эпасу "Калевала".

■ У 1872 г. нарадзіўся **Канстанцін Юльянавіч Кананові,** беларускі ўрач, вучоны ў галіне санітарыі і эпідэміялогіі. Ён арганізаваў у 1922 г. першую ў СССР санітарна-эпідэміялагічную станцыю (у г.Гомелі).

■ У 1922 г. у Вільні выйшаў першы нумар беларускай газеты **"Наша будучыня".** На жаль, выдавалася яна ўсяго некалькі месяцаў.

■ У 1943 г. у тагачаснай Віленскай вобласці пачала дзейнічаць супраць нямецкіх акупантаў **партызанская брыгада імя В.Будзённага.**

■ У 1987 г. у Вашынгтоне на савецка-амерыканскай сустрэчы ў вярхах быў падпісаны **Дагавор паміж СССР і ЗША аб ліквідацыі іх ракет сярэдняй і меншай дальнасці.**

■ У 1991 г. Рэспубліка Беларусь, Расійская Федэрацыя і Украіна падпісалі **Пагадненне аб Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).**

Старонкі храналогіі гартаў Юльян ГРЫГАРОВІЧ.

На "Навагодні кірмаш" прыдуць за подарункамі

У вас есть что предложить? Принимайте участие!

Новый год уже не за горами, к нему все готовятся — планируют, где и с кем его встречать, кому какие дарить подарки. Возможно поэтому все ждут традиционную ярмарку "Навагодні кірмаш", с ней связывают надежды, о ней говорят. Вспоминают добрым словом прошлогодний "Навагодні мінскі кірмаш" — он был удачным как для участников, так и для покупателей. Однако он уже вошел в историю, и нас гораздо больше интересует, каким будет "Кірмаш" нынешний. Об этом рассказывает директор ярмарки Алла Пухта:

— Ярмарка "Навагодні кірмаш" по традиции становится не просто открытием зимнего торгового сезона, но и значительным событием в жизни города. Именно эта ярмарка интересна тем, что тематически ее экспозиция будет очень разнообразной. Это и привлекает большое количество участников и посетителей.

— Время и место проведения ярмарки?

— "Навагодні кірмаш" будет проходить с 24 декабря 1997 г. по 11 января 1998 г. в Республиканском выставочном центре по ул.Я.Купалы, 27. По сравнению с выставочным павильоном по пр.Машерова, где мы проводили раньше новогодние ярмарки, этот павильон находится в более выгодном и удобном месте. Это центр города, следовательно, хорошее транспортное сообщение: близко станция метро, множество троллейбусных и автобусных маршрутов, возле павильона будет организована автостоянка. Надеемся, это скажется на увеличении количества посетителей, хотя их число всегда было высоким — около 30 тысяч человек ежегодно.

— Это хорошая перспектива для тех, кто будет участвовать в ярмарке: больше посетителей — больше и покупок. Но и число участников тоже, наверное, растет?

— Да, желающих принять участие с каждый годом все больше. Для сравнения, если в 1994 году было 140 экспонентов, то в 1996 — уже 180. Соответственно, в два раза увеличился объем закрытой экспозиционной площади. Надо заметить, что участники ярмарки всегда отмечали высокий уровень ее организации. Надеюсь, что и в этом году они останутся довольны. Во всяком случае, со стороны организаторов для этого делается все.

— Можно ли говорить о коммерческом успехе предыдущих ярмарок?

— По оценкам независимых экспертов объем продаж в предновогодние дни увеличивается в два раза, и, как показали предыдущие ярмарки, затраты экспонентов на участие в ярмарке окупаются за первые два дня работы. И потом, это ведь новогодняя ярмарка, куда люди приходят, чтобы выбрать подарки. А в качестве подарка можно преподнести любую вещь: и бытовую технику, и украшения, и книгу. Там, где присутствует настоящее праздничное настроение, где есть большой выбор хороших товаров, даже самые обычные вещи предстают в ином свете. И часто то, что не пользуется особым спросом в магазине, на ярмарке продается с большим успехом.

— А собственно, что можно представлять на этой ярмарке?

— Перечислять все направления экспозиции слишком долго. В общем, это самый широкий диапазон: одежда и обувь, косметика, электробытовые и хозяйственные товары, детские игрушки и одежда, книги, аудио- и видеопродукция и многое другое — все то, что можно преподнести в подарок. И, конечно же, елка и елочные украшения. На этот счет у каждого человека свои взгляды и возможности. Но "Навагодні кірмаш" — для всех. И не так важно, что человек купит — холодильник или аудиокассету — главное, что у него есть прекрасный выбор и возможность увидеть под одной крышей столь разнообразные товары.

— На ярмарке отношения "покупатель — продавец" тоже совершенно особенные, и, похоже, обе стороны довольны. В частности, у участников не всегда есть возможность представить свою фирму и свои товары такому широкому кругу покупателей. Понятно, что это выгодно и, вероятно, число заявок на участие в нынешней ярмарке увеличивается с каждым днем. Есть ли среди них постоянные участники?

— Конечно. Это фирмы "Тетрис", "Электросервис и К°", "Эльдорадо", "Девилон", ДТ "Первомайский", "Талио АТ", "Кравт" и другие. Интерес к ярмарке проявляют не только предприятия, магазины и фирмы, но и частные предприниматели, которые по своему опыту знают, что эта ярмарка — отличный шанс успешно реализовать свои товары. И потом, для постоянных участников существует гибкая система скидок.

— Назвав участников, нельзя обойти вниманием и организаторов выставки, ведь благодаря их усилиям, ярмарка приобретает популярность.

— Организаторы ярмарки — Выставочное общество "Экспофорум", Мингорисполком. Выставочная компания "Экспосервис", Республиканский выставочный центр Республики Беларусь. Информационным спонсором ярмарки выступает газета "Вечерний Минск". Мы проводим большую рекламную кампанию, целенаправленно ориентируя посетителей на активное посещение ярмарки. И это должно сыграть большую роль в том, чтобы она стала одним из самых популярных торговых мест в городе.

Пользуясь случаем, хочу обратиться ко всем потенциальным участникам ярмарки. Подготовка к ярмарке идет вовсю, и упускать свой шанс не стоит — ведь "Навагодні кірмаш" бывает только раз в году, как и тот праздник, к которому он приурочен. Можете ли вы предложить как вариант подарка свой товар? Подумайте и примите решение.

Справки Вы можете получить по телефонам: 256-76-02, 256-49-03; тел./факс: 213-56-36.

ГРУЗОПЕРЕВОЗКИ

Цена одной строки 50 000 руб.
Тел./факс (017) 229-29-04.

Фирма	Тоннаж	Дальность	Телефон
Организация	от 1—8 т.	г.Минск, РБ, СНГ	(017) 252-05-72, 258-68-66

Приглашаем заинтересованных лиц разместить строчную рекламу в рубриках:
1. ГРУЗОПЕРЕВОЗКИ (по субботам)
2. МЕТАЛЛОПРОКАТ (по средам)
3. ПРОДУКТЫ ПИТАНИЯ (по пятницам)

Стоимость одной строки - 50 000 руб.
Тел./факс (017)229-29-04.

PANASONIC SONY LG SAMSUNG — ГАРАНТИЯ ИЗГОТОВИТЕЛЯ
ТВ 36, 51, 54 см: от 210, 265, 320 $
ТВ 63, 72 см: от 535, 855 $
Муз. центры: 260 - 510 $
Видеокамеры: от 390 $
Видеомагнитофоны: от 165 $
Магнитолы с CD: от 115 $
Hi-Fi компоненты
Акустика Car Audio
Тел.: (017) 227-10-90, 227-90-25

6–13 снежня ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

ВЫСТАВЫ

У Нацыянальным мастацкім музеі *да 8 снежня* працуе выстава, прысвечаная памяці знакамітага беларускага графіка Леаніда Марчанкі. Прадстаўлены работы 60—90-ых гадоў: малюнкі (аловак, акварэль), эстампы (літаграфія, афорт). Таксама ў музеі можна пазнаёміцца з выставай твораў жывапісу рускага мастацтва канца XIX — пачатку XX стагоддзя "Образ твой мучительный и зыбкий!..".

У Палацы мастацтваў *з 9 снежня* працуе выстава, прысвечаная 50-годдзю мастака з Оршы Мікалая Таранды (жывапіс, графіка). *З 10 снежня* ў Палацы можна будзе пазнаёміцца з творчасцю Ігара Тапіліна. Нягледзячы на тое, што ў пераважнасці Ігара Тапіліна ведаюць як мастака-пастаноўшчыка кінафільмаў, на выставе будуць прадстаўлены яго жывапісныя творы.

У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі з нагоды юбілею працуе выстава "100 рарытэтаў з калекцый Нацыянальнага музея Беларусі", экспанаты якой з'яўляюцца падмуркам і музейнай калекцыі, і нацыянальнай культурнай спадчыны. Экспазіцыя створана на аснове унікальных помнікаў найбольш значных музейных калекцый. Тут прадстаўлены каштоўныя ўпрыгожванні са старажытных курганоў, манетныя скарбы, іконы, кнігі, заходнеэўрапейскі фарфор, беларускае мастацкае шкло і нават скрыпкі італьянскіх майстроў XVI—XVIII стагоддзяў.

Людзям, адданым сваёй справе, якія стаялі ля вытокаў стварэння музея, і тым, хто працуе тут зараз, прысвечана выстава "Яны стваралі музей".

Па-ранейшаму ў музеі можна акунуцца ў свет "Казачных фантазій".

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае наведаць экспазіцыю "Радавыя Перамогі", прысвечаную ваенным лёсам простых салдат, якая распавядае пра трагедыю беларускага народа ў перыяд фашысцкай акупацыі. Працуе ў музеі і выстава "Першыя ўзнагароды Вялікай Айчыннай вайны", прымеркаваная да 50-годдзя з дня заснавання першых медалёў і ордэнаў. Працуе таксама выстава "Нам засталася спадчына", прысвечаная юбілеям пяці беларускіх літаратараў — М.Танка, Я.Брыля, Я.Коласа, Я.Купалы і П.Панчанкі.

У Літаратурным музеі Янкі Купалы — выстава "У сугуччы культур. Віленскія постаці беларусаў", прысвечаная 115-ай гадавіне з дня нараджэння Янкі Купалы.

У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа да 115-годдзя з дня нараджэння песняра працуе выстава "Інскрыпты Коласа" (дарчыя надпісы на кнігах і фотаздымках). Выстава ўпершыню прадстаўляе цікавейшыя матэрыялы з рукапіснай скарбніцы Якуба Коласа.

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры запрашае наведаць наступныя выставы: ***"Покліч"*** — знаёміць з літаратурным працэсам 20—30-ых гадоў на Беларусі, лёсамі рэпрэсіраваных пісьменнікаў; ***"Любоў мая... Мая Беларусь"*** — распавядае пра жыццёвыя і творчыя шляхі беларускіх жанчын, якія пакінулі свой след у культурнай і мастацкай спадчыне беларусаў; ***"З новых паступленняў"*** — рэпрэзентуе самыя цікавыя матэрыялы з фондаў музея, якія паступілі за апошнія гады; ***"Яны прайшлі па той вайне..."*** — прысвечаная беларускім пісьменнікам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, змяшчае мастацкія творы, якія адлюстроўваюць трагічныя падзеі таго часу на Беларусі. Працуе выстава ***"І вера, і вернасць, і вечнасць"***, прысвечаная беларускаму літаратару Пімену Панчанку.

Мастацкі цэнтр "Жыльбел" *(вул. М.Багдановіча, 9а)* запрашае пазнаёміцца з творамі беларускіх мастакоў: Уладзіміра Акулава, Рыгора Несцерава, Ягора Батальёнка, Уладзіміра Савіча, Георгія Скрыпнічэнкі, Уладзіміра Шапялевіча, Сяргея Малішэўскага, Канстанціна Андруковіча, Вікторыі Загнетавай (Гродна), Леаніда Мядзведскага (Віцебск) і з творчасцю маладых мастакоў Беларусі.

У галерэі "Мастацтва" *(пр-т Ф.Скарыны, 12) да 11 снежня* можна пазнаёміцца з творчасцю выкладчыка кафедры дызайна Акадэміі мастацтваў Льва Талбузіна (сучасная пластыка) і лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесарам кафедры рысунка Акадэміі мастацтваў Уладзіміра Тоўсціка (жывапіс).

У галерэі "Верхні горад" *(пл. Свабоды, 5)* — творы беларускіх мастакоў: Алега Скавародкі (Віцебск), Ігара Рымашэўскага, Леаніда Шчамялёва, Мікалая Бушчыка, Яны Первяковай, Дзмітрыя Маслея, Дзмітрыя Зяньковіча, Ніны Голышавай, Эдуарда Багранцава, Валянціна Губарава і іншых. Таксама тут можна наведаць экспазіцыю мастака Алеся Сушы. Дарэчы, амаль усе творы, прадстаўленыя на выставе, можна набыць.

Камерцыйная галерэя "Гал-творчасць" *(пр-т Ф.Скарыны, 47)* прадстаўляе вядучых майстроў беларускага жывапісу. У экспазіцыі — творы мастакоў Бараноўскага, Кузьміча, Аракчэева, Ясюк, Нямцова, Герасімава, Шаранговіча і іншых. Творы, прадстаўленыя на выставе, можна набыць.

Галерэя візуальных мастацтваў "NOVA" *(вул. В.Харужай, 16)* да ***10 снежня*** запрашае на выставу "Сбереги себя для жизни" і "СПИД без выдумки".

У музеі сучаснай беларускай скульптуры імя Андрэя Бэмбеля *(вул. Я.Коласа, 29а)* — IV штоквадовая справаздачная выстава студэнтаў кафедры скульптуры Акадэміі мастацтваў Беларусі.

Музей землязнаўства *(пр-т Ф.Скарыны, 4)* прапануе пазнаёміцца з унікальнай калекцыяй мінералаў і горных парод.

Музей славянскага быту *(вул. Жылуновіча, 15)* прадстаўляе калекцыю самавараў і прадметаў славянскага быту, патэфоны, посуд, калекцыю ікон мастачкі Тамары Шаўцовай.

У Палацы культуры чыгуначнікаў — выстава "Жывёлы Амерыкі". Тут вы маеце магчымасць пабачыць шэсць відаў каралёўскіх змей, імператарскага ўдава, павукоў-птушкаедаў, шлемяносную ігуану і іншых амерыканскіх экзатычных жывёлін.

Галерэя "Вільня" *(вул. Каліноўскага, 55)* запрашае пазнаёміцца з жывапіснымі палотнамі Серафімы Патапавай.

У Доме літаратара *(вул. Фрунзе, 5)*

8 снежня — "Мне доўгае расстанне з Вамі...", літаратурна-мастацкая вечарына да дня нараджэння Максіма Багдановіча.

11 снежня — "З берагоў блакітнага Дуная", вечарына славацкай паэзіі.

12 снежня — сустрэча маладых беларускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў.

КАНЦЭРТЫ

У канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі *(пр.Ф.Скарыны, 50)*

6 снежня — абанемент №4. "Сусветная мастацкая культура" — "Садружнасць муз". Вядучыя — Алег Ойстрах і Тацяна Старчанка.

7 снежня — абанемент №2. "Музычныя падарожжы", святочныя сустрэчы з салістамі Філармоніі для дзяцей і юнацтва, Белдзяржфілармоніі і беларускімі кампазітарамі. У канцэрце таксама прымаюць удзел вучні рэспубліканскага ліцэя пры Беларускай акадэміі музыкі, Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа.

10 снежня — абанемент №9. Спяваюць узорныя дзіцячыя харавыя калектывы: лаўрэаты міжнародных конкурсаў і фестываляў.

13 снежня — абанемент №3. "Дзіцячыя гады любімых кампазітараў". Музыказнаўца — Анатоль Парэцкі. У канцэрце прымаюць удзел салісты Філармоніі для дзяцей і юнацтва, вучні і настаўнікі рэспубліканскага ліцэя пры Беларускай акадэміі музыкі.

У зале камернай музыкі *(пр. Ф.Скарыны, 44а)*

6 снежня — абанемент №10. Арганная музыка. Выканаўца — Канстанцін Шараў, музыказнаўца — Вольга Савіцкая.

ФЕСТЫВАЛІ

У канцэртнай зале "Кастрычнік"

6 снежня — афіцыйная цырымонія занясення ў сусветную "Кнігу рэкордаў Гінеса" першага ў гісторыі сусветнай культуры фестывалю творчасці аднаго аўтара і прадюсера пяці эксклюзіўных праграм у імя Беларусі, а таксама адбудуцца IV і V канцэрты аўтарскага фестывалю Мікалая Трацякова.

ТЭАТРЫ

Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы

6 снежня — Дж.Вердзі "Аіда", опера ў чатырох дзеях.

7 снежня — **ПРЭМ'ЕРА!** Дж. Вердзі "Травіята", опера ў чатырох дзеях.

9 снежня — вечарына рускага раманса.

11 снежня — П.Чайкоўскі "Яўген Анегін", опера ў чатырох дзеях.

13 снежня — Дж.Вердзі "Рыгалета", опера ў трох дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр балета

7 снежня — А.Залётнеў "Круговерть", балет у адной дзеі і адзінаццаці сюжэтах.

10 снежня — **ПРЭМ'ЕРА!** І.Стравінскі "Весна священная" (карціны паганскай Русі), балет у адной дзеі. А таксама — "Кармина Бурана" (вакальна-харэаграфічнае прадстаўленне), балет у адной дзеі.

12 снежня — А.Мдзівані "Страсці" ("Рагнеда"), балет у дзвюх дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы

6 снежня — "Смерць Кандзіда Тарэлкіна". На Малой сцэне — С.Мрожак "Чароўная ноч", сон без антракту.

7 снежня — "Памінальная малітва", а таксама "Пунсовая кветачка".

8 снежня — А.Астроўскі "Лес", камедыя ў дзвюх дзеях.

9 снежня — На Малой сцэне — **гастролі Рускага драматычнага тэатра Літвы** — Ф.Дастаеўскі "Сказка идиота".

10 снежня — "Ледзі Нявіннасць". На Малой сцэне — "Крывавая Мэры".

11 снежня — на Малой сцэне — "Крывавая Мэры".

12, 13, 14 снежня — А.Дудараў "Князь Вітаўт", легенды сівой даўніны.

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі

9 снежня — Б.Брэхт "Узлёт Артура Уі, які можна было спыніць", трагіфарс.

12 снежня — С.Кандрашоў "Містэр Розыгрыш", гульні дарослых.

13 снежня — У.Галубок, Л.Радзевіч "Паваліўся нехта", фольк-жарт.

Мінскі тэатр сатыры і гумару "Хрыстафор" *(у памяшканні Палаца культуры прафсаюзаў)*

7 снежня — "Ад Чыжоўкі да Камароўкі", культурна-гумарыстычнае мерапрыемства.

11 снежня — "ЖЭНЕФІС" Яўгена Крыжаноўскага.

12 снежня — "Выбранае", лепшае, што створана тэатрам за апошнія дзесяць год.

13 снежня — "М" і "Ж", спецыяльны выпуск толькі для жанчын (і мужчын).

Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра "Зьніч" пры Белдзяржфілармоніі *(у дольнай зале Касцёла святых Сымона і Алены — пл.Незалежнасці, 15)*

8 снежня — Ф.Дастаеўскі "Кроткая", монаспектакль. Выканаўца — У.Шэлестаў.

10 снежня — "Віленскія мроі", монаспектакль паводле ўспамінаў Юльяны Вітан-Дубейкаўскай з роду Мэнке і вершаў Надзеі Артымовіч. Выканаўца — Галіна Дзягілева.

У Дзяржаўным акадэмічным рускім драматычным тэатры імя М.Горкага

6 снежня — Д.Фо, Ф.Рамэ "Свободный брак" у дзвюх частках.

7 снежня — Д.Мережкоўскі "Христос и Антихрист", трагедыя ў дзвюх частках.

9 снежня — М.Ашар "Кто твой любовник, Жозефа?", камедыя-дэтэктыў у дзвюх частках.

10 снежня — В.Вайновіч "Необыкновенные приключения солдата Чонкина", народны анекдот у дзвюх частках.

11 снежня — І.Губач "Адъютант-Ша Его Величества", камедыя ў дзвюх частках. На Малой сцэне — Ж.-К.Брысвіль "Ужин", п'еса ў дзвюх частках.

12 снежня — Е.Папова "Баловни судьбы", трагікамедыя ў дзвюх частках. Ф.Шылер "Братья Моор", драма ў дзвюх частках.

13 снежня — А.Дудараў "В сумерках", драма ў дзвюх частках.

Тэатр-студыя кінаакцёра

9, 10 снежня — "Мы идем смотреть "Чапаева".

11, 12 снежня — "Айседора. Танец любви".

13 снежня — "Похищение Елены".

Тэатр юнага гледача

6 снежня — С.Пракоф'ева, І.Такмакова "Чипполино и его друзья", а таксама К.Гоцы "Счастливые нищие".

7, 10 снежня — "Ищи ветра в поле".

9 снежня — А.Хайт "День рождения кота Леопольда".

10 снежня — К.Гоцы "Счастливые нищие".

11 снежня — С.Пракоф'ева, І.Такмакова "Чипполино и его друзья".

12 снежня — Г.Палонскі "Никто не поверит".

13 снежня — Дзень сям'і ў тэатры. К.Гоцы "Счастливые нищие".

Дзяржаўны маладзёжны тэатр эстрады

8 снежня — першая прыватная антрэпрыза "Тэатральныя зоркі". Майстры сцэны ў рэтра-шлягеры А.Валодзіна "Пяць вечарын".

Тэатр музычнай камедыі

6, 13 снежня — "Шляпа Наполеона".

7 снежня — "Моя жена — лгунья".

11 снежня — "Принцесса цирка".

12 снежня — "Марица".

У клубе імя Дзяржынскага *(вул. Камсамольская, 30)*

11 — 12 снежня — **ПРЭМ'ЕРА!** Спектакль па п'есе Альда дэ Бенедэтцы "Сублимация любви".

Падрыхтавала Марына КОКТЫШ.

Хочаце — верце, хочаце — не верце...

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

Авенам (21 сакавіка — 20 красавіка) — перыяд добрых адносінаў з людзьмі. Узнагарода за вашу празмерную працу, сцвярджаюць планеты, абяцае быць адэкватнай затрачаным сілам. Пры ўмове, што вы не будзеце вельмі многа аб гэтым гаварыць. Планеты раяць выкарыстаць дадзены лёсам шанц і, нягледзячы на вялікую колькасць працы, адправіцца ў прыемнае падарожжа з дарагім сэрцу чалавекам. Будзьце асцярожнымі з электрапрыборамі. Разлічвайце толькі на сябе, праявіце абачлівасць і трымайцеся як мага далей ад сумніўных спакус.

Цяльцам (21 красавіка — 21 мая) — сутычкі. Верагодна, дзякуючы сваёй упартасці і вытрымцы, вам удасца схаваць ад чужых вачэй свае хваляванні і непатрэбныя эмоцыі. Аднак тое, што павінна адбыцца на наступным тыдні, выразна прадэманструе, што амаль усе хваляванні часам былі выкліканы выключна вашымі пужлівымі фантазіямі. Мабыць, у другой палове тыдня настрой палепшыцца. Гэтаму, як сцвярджаюць зоркі, будзе спрыяць і вялікі фінансавы куш.

